*Клімаў І.П. (Мінск)*

# ЗНАЧЭННЕ РЭЛІГІЙНАГА ПІСЬМЕНСТВА ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ ЛІТАРАТУРЫ І МОВЫ

*Предлагается рассматривать религиозную письменность как целостный объект, который обладает собственными параметрами, отличающими яго от других письменных сфер. Обсуждаются основные параметры такого объекта и его влияние на развитие литературы и языка в культуре европейских народов.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паняцце «рэлігійнае пісьменства» ў дадзенай працы ўжываецца ў агульным значэнні «пісьмовы масіў рэлігійных тэкстаў», без падзелу яго на асобныя жанры і іх разнавіднасці. Адмова ад такога падзелу абумоўлена мэтамі працы – вызначыць перспектывы даследавання рэлігійнага пісьменства як адзінай сукупнасці тэкстаў і жанраў. Натуральна, рэлігійнае пісьменства практычна ў кожнай культуры мае вялікую жанрава-функцыянальную разнастайнасць і прадстаўлена вялікай колькасцю тэкстаў, якія выконваюць розныя функцыі. Аднак у дадзенай працы такая разнастайнасць да пэўнай ступені ігнаруецца – каб больш відавочна акрэсліць значэнне рэлігійнага пісьменства для гісторыі літаратуры і мовы.

Да рэлігійнага пісьменства ў дадзенай працы аднесены тэксты і жанры, якія так або інакш звязаныя з рэлігіяй. У гэтым выпадку яны ў той ці іншай ступені адлюстроўваюць змест і мэты рэлігіі, транс-

лююць яе паняцці, ідэі і вобразы, спрыяюць уздзеянню рэлігійнай сімволікі і ідэалогіі на чытачоў (слухачоў, гледачоў), а праз іх – і на ўсё грамадства. Гэта ў многім абумоўлівае і спецыфіку самога рэлігійнага пісьменства (параўнальна з іншымі масівамі пісьмовых тэкстаў). Яно ўспрымаецца (прычым не толькі вернікамі) як надзеленае нейкімі рэлігійнымі ўласцівасцямі, рысамі. Фактычна на яго пераносяцца ўласцівасці рэлігійных артэфактаў і вобразаў, з якімі такое пісьменства звязанае, якія яно адлюстроўвае. Натуральна, гэта толькі аберацыя, уяўленне. Аднак такое ўяўленне падзяляюць звычайна і стваральнікі, і карыстальнікі рэлігійнага пісьменства, што на самой справе стварае ўмовы для своеасаблівых адносін да яго.

Як вынік, з самых ранніх часоў рэлігія цалкам ці ў значнай ступені ўздзейнічала на пісьменства. Гэтае ўздзеянне адбывалася па многіх кірунках. Рэлігія вызначала яго склад, дыстрыбуцыю і развіццё – і ўсяго пісьменства, і пэўных яго жанраў ды сфер. Рэлігія фактычна абумовіла ўзнікненне многіх новых жанраў і паўплывала на развіццё тых, якія ўжо існавалі ў гэтым грамадстве да прыходу дадзенай рэлігіі ці былі прынесеныя ёю – апошнія мусілі прыстасоўвацца да ўмоў мясцовай культуры. Рэлігія таксама ўплывала на развіццё нерэлігійнага пісьменства грамадства, якое немінуча з'яўлялася ці развівалася побач з рэлігійным (нягледзячы на канкурэнцыю з ім). Такі ўплыў адбываўся двума шляхамі: праз само рэлігійнае пісьменства, якое транслявала свае ўзоры і здабыткі ў творы іншых сфер, і праз рэлігійны светапогляд аўтараў і карыстальнікаў, якія выражалі рэлігійныя ідэі ў тых або іншых жанрах і тэкстах. Праўда, ступень ўздзеяння рэлігіі на пісьменства ў розныя эпохі была неаднолькавая.

Дамінаванню рэлігіі ў сферы пісьмовай камунікацыі канец кладзе эпоха Асветніцтва (прыкладна 2-я палова XVIII ст.), ва ўсялякім выпадку, такая храналагічная мяжа выразная ў заходняй цывілізацыі. Менавіта ў гэтую эпоху там пачынаюцца і ўзмацняюцца працэсы секулярызацыі грамадства, а ўплыў рэлігіі на літаратуру і пісьменства наогул паступова слабее і ў XIX–XX стст. знікае зусім. Склад і аб'ём рэлігійнага пісьменства ў гэтыя часы абвужаецца, а само яно перастае ўплываць на іншыя пісьмовыя сферы. У цяперашні час такі ўплыў практычна адсутнічае ці ледзь заўважны, а само рэлігійнае пісьменства займае даволі сціплую нішу ў пісьмовай камунікацыі грамадства; памер такой нішы залежыць ад ступені клерыкалізацыі таго ці іншага сучаснага грамадства. Такім чынам, менавіта ў мінуласці рэлігія дасягнула значнага ўплыву на пісьменства, у многім прадвызначаючы

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

патэнцыял развіцця літаратуры і пісьменства. Гэта выводзіць на пярэдні план вывучэння менавіта старажытную эпоху, абумоўлівае асабліва пільную ўвагу да яе з боку даследчыка.

Асабліва значнай была роля рэлігійнага пісьменства ў пісьмовай, кніжнай камунікацыі еўрапейскіх народаў эпохі Сярэднявечча і ранняга Новага часу. У тыя часы такое пісьменства складала ідэйную аснову і выяўленча-стылістычны цэнтр літаратуры гэтых народаў, а таксама моцна ўплывала на іншыя сферы – літаратурна-мастацкае і юрыдычна-справавое пісьменства. Яно таксама моцна ўздзейнічала на складванне моўных адносін у пісьмовай сферы, забяспечваючы там панаванне кніжнай мовы, часта з наяўнасцю ў такой мове архаічных, штучных і іншамоўных элементаў, а то і наогул у выглядзе чужыннай мовы. Як вынік, рэлігійнае пісьменства (нават на чужыннай мове) фактычна стварала аблічча даўняй кніжна-пісьмовай мовы, прадвызначала кірункі яе развіцця на працягу многіх стагоддзяў і ў значнай ступені абумовіла форму ды выгляд многіх нацыянальных літаратурных моў у сучаснасці. У канчатковым выніку такое пісьменства, прыносячы новыя рэлігійныя ці канфесійныя ідэі і плыні, рабіла значны ўплыў на развіццё міжмоўных і міжкультурных сувязяў, садзейнічала развіццю кантактаў паміж рознымі культурамі ды народамі і іх мовамі. У дадатак, рэлігійнае пісьменства з даволі ранніх часоў мела тэндэнцыю да стандартызацыі сваіх формаў і выкарыстання характэрных тыпалагічных сродкаў. Можна вылучыць пэўныя літаратурныя (ці хутчэй функцыянальныя) паказчыкі рэлігійнага пісьменства, якія прысутнічаюць у розных культурах: семантычная замкнёнасць, жанравая выразнасць, экспрэсійнасць, эстэтычная вартасць. Гэтыя паказчыкі істотна не змяняліся на ўсім працягу развіцця сістэмы рэлігійнага пісьменства. Разам з тым яно не заставалася нейкай адасобленай з'явай і развівалася ў кантэксце культурных змен свайго грамадства.

Галоўная адметнасць рэлігійнага пісьменства – гэта яго надзвычай высокі культурны і сацыяльны статус (у еўрапейскім кантэксце – па меншай меры, да эпохі Рамантызму). Толькі з гэтым пісьменствам у эпоху Сярэднявечча ды ранняга Новага часу звязваюцца найбольш значныя культурныя вартасці. У сваю чаргу, сацыяльныя колы, што забяспечвалі існаванне і развіццё такога пісьменства (гэта перш за ўсё духавенства), таксама атрымлівалі высокі культурны статус.

Займаючы цэнтральнае, пануючае становішча ў камунікацыі грамадства, рэлігійнае пісьменства на еўрапейскім кантыненце было

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прасякнута шэрагам лінгвакультурных апазіцый, якія можна сфармуляваць у тэрмінах італьянскага Адраджэння (яно першым пачало задумлёўвацца над гэтымі пытаннямі). Гэта такія апазіцыі, як пісьмовае – вуснае (scritto vs. orale), кніжнае – някніжнае (аказіянальнае) (curiale vs. volgare), сакральнае – прафаннае (свецкае) (sacro vs. profano), культурнае – побытавае (dotto vs. rustico), высокае – нізкае (aristocrato vs. populare). Яны, з аднаго боку, дыферэнцавалі пісьмовыя жанры і сферы, уводзячы новыя падзелы і ідыёмы ў дадатак да ўжо існуючых функцый, а з другога, узмацнялі межы і самога рэлігійнага пісьменства, і жанраў ды сфер унутры яго, надаючы ім стабільнасць, устойлівасць, выразна аддзяляючы ад іншых галін вербальнай камунікацыі.

У камунікацыі любога грамадства рэлігійнае пісьменства займае пэўную культурную прастору, прычым, нягледзячы на сваю «сакральнасць», зусім не статычную, а даволі рухомую, дынамічную. З цягам стагоддзяў такая прастора паступова змяняе і свае межы, і ступень свайго ўздзеяння на іншыя галіны вербальнай камунікацыі. Гэтая прастора не толькі служыць для выканання пэўных рэлігійных функцый, але і становіцца, як было адзначана, генератарам літаратурнай і моўнай традыцыі. Рэлігійнае пісьменства выпрацоўвае свае выяўленчыя адметнасці, тыповыя моўныя сродкі і заканамернасці іх выкарыстання, дыяпазоны прымальных адхіленняў і варыянтаў. У дадатак, сваімі сродкамі рэлігійнае пісьменства істотна пашырае мастацка-эстэтычны патэнцыял літаратуры, яе сацыяльную прывабнасць і папулярнасць. Усё гэта з'яўляецца важнай культурнай заслугай рэлігійнага слова.

Застаецца шкадаваць, што ў адрозненне ад іншых відаў старажытнага пісьменства – літаратурна-мастацкага і юрыдычна-справавога – рэлігійнае амаль ніколі не даследуецца ў сваёй сукупнасці як адзіная з'ява. Звычайна вывучаюцца асобныя жанры або помнікі ці іх развіццё і функцыянаванне на пэўным этапе, у пэўную эпоху, або на пэўным фоне. Між тым, рэлігійнае пісьменства патрабуе самага пільнага вывучэння як цэласная сістэма жанраў і цэласны комплекс тэкстаў, важны для развіцця нацыянальнай спадчыны і культуры. У гэтым кірунку яшчэ шмат чаго трэба вывучыць і асэнсаваць. Немалаважнай праблемай тут з'яўляецца нераспрацаваны тэарэтычны апарат.

Пэўную складанасць у гэтай справе ўтварае значны аб'ём і жанравая разнастайнасць рэлігійнага пісьменства. Гэтая акалічнасць замінае яго поўнаму ахопу і шматаспектнаму вывучэнню і патрабуе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

застасавання даволі розных методык і падыходаў. Такая адсутнасць метадалагічнай аднастайнасці можа паставіць пад пытанне суадноснасць атрыманых вынікаў. Іншы праблемны аспект – суадносіны ў рэлігійным пісьменстве традыцый і навацый, кніжных і маўленчых з'яў, прагрэсіўных і архаічных тэндэнцый. Рэлігійныя помнікі нярэдка ўспрымаюцца як сакральныя аб'екты, застылыя, ледзь не амярцвелыя здабыткі архаічнай мовы, носьбіты кансерватыўнай традыцыі. У многім такі погляд апраўданы, аднак нават пры гэтым нельга адмаўляцца ад вывучэння змен і кірункаў развіцця рэлігійнага пісьменства. Даследаванні апошніх дзесяцігоддзяў паказалі, што нават літургічныя тэксты на сакральнай мове не пазбаўленыя дынамікі і эвалюцыі. У іншых жа жанрах і сферах такія змены былі яшчэ больш заўважнымі і значнымі, нярэдка ахопліваючы адметны дыяпазон сродкаў на многіх моўных узроўнях. Таму рэлігійнае пісьменства заслугоўвае асобнага і самага дэталёвага разгляду – і ў сукупнасці сваіх жанраў, і як цэласная з'ява, што праяўляе свае рысы ды ўласцівасці ў любым рэлігійным помніку, у любога рэлігійнага аўтара.

***Трифонова Н.Я.*** *(Минск)*

## ШЕРЕШЕВСКОЕ ЕВАНГЕЛИЕ ИЗ СОБРАНИЯ НАЦИОНАЛЬНОГО ХУДОЖЕСТВЕННОГО МУЗЕЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

*Рассматриваются история изучения, художественные особенности так называемого Шерешевского Евангелия, Евангелия 1568 г., Ирмолога 1775 г. Отмечена полнота и разнообразие орнаментальных и изобразительных элементов в декоре Шерешевского Евангелия, которые выделяют эту рукопись среди иллюминированных белорусских Евангелий XV–XVI вв. Еще одним примером использования свойственных балканскому стилю орнаментальных мотивов является рукописное Евангелие 1568 г. Ирмолог из музейного собрания дает представление об особенностях оформления белорусских певческих книг XVIII в.*

Собрание рукописей Национального художественного музея Республики Беларусь немногочисленно. Оно включает Евангелия, певче-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ